Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

Далучайся!

№ 9 (216) ЧЭРВЕНЬ 2016 ГОДА

БЕЛАРУСКАЕ ЗЛАМОЎНАЕ ПАЖАДАННЕ

Дай, божа, вам пабіцца, а мне на вас падзівіцца

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ – 2016

У ГАРАДКУ БУДЗЕ ЦЭНТР ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

8 чэрвеня Цэнтрвыбаркам прыняў пастанову аб зацвярджэнні выбарчых акругаў у выбарчай кампаніі 2016 году ў Палату прадстаўнікоў. Упершыню акруговая выбарчая камісія будзе размяшчацца ў Гарадку, у памяшканні Гарадоцкага райвыканкаму.

Адпаведна Пастановы № 17 ад 8 чэрвеня Цэнтрвыбаркам зацвердзіў спіс 110 выбарчых акругаў у кампаніі 2016 года, якая фінішуе 11 верасня. Адпаведна сярэдняспіскавай колькасці выбаршчыкаў на акругу адбылося нязначнае перайменаванне межаў выбарчых акругаў на Віцебшчыне. Так ўпершыню акруга № 21 займела цэнтр у Гарадку. У межах нашай акругі засталіся Шумілінскі, Гарадоцкі раёны і г.п. Руба г. Віцебска, а таксама ўвесь Віцебскі раён, які у мінулую кампанію ўваходзіў уакругу без Кастрычніцкага і Шапечанскага сельсаветаў. Колькасць выбаршчыкаў у акрузе – 64 921.

Акруговая камісія будзе размяшчацца па вул. Пралетарская д.2 ў памяшканні Гарадоцкага райвыканкаму. Утворана акруговая камісія павінна не пазней 27 чэрвеня, а дакументы на вылучэнне ў яе павінны быць пададзены не пазней 24 чэрвеня.

Нагадаем, што ў папярэднім скліканні ПП НС Рэспублікі Беларусь кампанія праходзіла па Віцебскай сельскай выбарчай акрузе № 21. А ў самым пачатку4 існавання Палаты прадстаўнікоў Гарадоцкі раён уваходзіў у Шумілінскую выбарчую акругу разам з Бешанковіцкім раёнам.

Відавочна, што перанос цэнтра акругі ў Гарадок выкліканы найперш значным добраўпарадкаваннем нашага райцэнтра ў перыяд падрыхтоўкі да «Дажынак —2014». Глядзіш і да фініша гэтай кампаніі ў Гарадку дабудуюць даўгабуд — басейн у мікрараёне вул. Гагарына ды і «Еўраопт» па вул. Таўкачова.

Л. Антонаў

ЭКАЛОГІЯ

НЕБЯСПЕЧНАЯ РАСЛІНА

Пасля массавага запаўнення тэрыторыі Гарадоччыны баршчэўнікам Сасноўскага шкодная расліна з'явілася і ў райцэнтры ў мікрараёне вул. Баграмяна.

Баршчэўнік Сасноўскага стаў небяспечный інвазійный культурай, якая на Віцебшчыне захоплівае ўсё большыя тэрыторыі. У вобласці выяўлена больш адной тысячы месцаў на плошчы больш 1 300 га, дзе буяе баршчэўнік.

У Гарадоцкім раёне баршчэўнік пачаў распаўсюджавацца з сорта-выпрабавальнай станцыі ў в. Паўловічы каля Стадолішча і зараз мае тэрыторыю распаўсюду па афіцыйных даных каля 170 га. Дарэчы такая тэрыторыя распаўсюду баршчэўніка і ў сталіцы краіны г. Менску — 165 га. У Менску ў гэтым годзе пастаўлена задача поўнасцю ліквідаваць баршчэўнік і на гэту мэту з бюджэту выдаткаваны адзін мільярд рублёў.

У Гарадку таксама з'явіліся ачагі шкоднага баршчэўніка. Самы вялікі баршчэўнік выяўлены каля вучэбнага палігона Гарадоцкай РЭС, амаль побач са стадыёнам Гарадоцкага агратэхнічнага каледжа.

Расце баршчэўнік і побач з дарогай па вул. Баграмяна каля паварота на вул. Новую. Тут яго ўжо скасілі, але баршчэўнік працягвае расці. І патрабуецца яго выдаленне праз выкопванне.

Відавочна, што вялікае распаўсюджванне баршчэўніка Сасноўскага на Гарадочыне — ўжо значная экалагічная праблема, якая патрабуе свайго вырашэння пры грамадскім кантролі.

Баршчэўнік Сасноўскага — буйная (да 3 м) шматгадовая расліна. Цвіце адзін раз у жыцці з ліпеня па жнівень. У сярэднім адно пустазелле дае каля 20 тыс. насення, але асобныя расліны могуць прадукаваць больш за 100 тыс. насення. Расліна ўяўляе пагрозу здароўю людзей і выклікае экалагічныя праблемы: з-за хуткага развіцця папуляцый выцясняе іншыя расліны і захоўвае дамінуючую пазіцыю на захопленых тэрыторыях. Судотык са сцеблами, лісцем, кветкамі баршчэўніка, асабліва ў сонечныя дні, прыводзіць да з'яўлення на скуры апёкаў.

Леанід Гаравы

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

РАЙСАВЕТ

АДМЕНА РАШЭННЯ АБ ПАДТРЫМКІ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

Гарадоцкі раённы Савет дэпутатаў прызнаў страціўшым сілу свае рашэнне ад 18 лістапада 2013 г. N183 «Аб парадку аказання дзяржаўнай падтрымкі юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам»

Гарадоцкі райсавет на падставе пункта 1 артыкула 13 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 года «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» вырашыў прызнаць страціўшым сілу рашэнне Гарадоцкага раённага Савета дэпутатаў ад 18 лістапада 2013 г. No 183 «Аб парадку аказання дзяржаўнай падтрымкі юрыдычныміасобам і індывідуальным прадпрымальнікам»

Гэта рашэнне ўступіла ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання на Нацыянальным прававым Інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь 15 чэрвеня 2016 г.

Існаваўшае больш двух гадоў рашэнне райсавета амаль ніякім чынам не палепшыла жыццё юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам Гарадоччыны, бо інструкцыі для яго ажыццяўлення ніякім чынам не сталі вядомы грамадству. Гэтымі інструкцыямі, якія адразу былі зацверджаны ў 2013 годзе райсаветам, прыдугледжваўся парадак прадастаўлення адтэрміноўкі і (або) растэрміноўкі выплаты падаткаў, збораў і пені, падатковага крэдыту для прадпрымальнікаў, таксама магчыма было прадастаўленне з раённага бюджэту фінансавай дапамогі, а таксама прыдугледжваўся асобы парадак вяртання бюджэтнай пазыкі або займа. Толькі вось у бюджэце ніякім чынам не магчыма было гэта ажыццявіць.

Ці з'явіцца яшчэ адно рашэнне аб аказанні дзяржаўнай падтрымкі ў Гарадоцкім раёне юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам пакажа час. Але больш істотна, каб такое рашэнне было жывым, а не «мёртвым» жаданнем дапамагчы прадпрымальнікам. Ды і «тучныя» гады для бюджэта скончыліся...

Л. Антонаў

АДУКАЦЫЯ

АПОШНІ ЗВАНОК ДЛЯ ТРОХ ШКОЛ, ЯКІЯ ЗАКРЫВАЮЦЬ

30 траўня адбыўся самы «Апошні званок» для педагогаў, навучэнцаў трох школ Гарадоччыны, якія не будуць працаваць у наступным навучальным годзе. Гэта былыя сярэднія школы, якія на сёння былі базавымі: Вайханская і Стадалішчаская школы, а таксама Кабішчанскі дзіцячы сад-базавая школа.

Па прапанове абласных уладаў рашэннем Гарадоцкага райвыканкаму ў гэтым годзе ўпершыню закрываецца аж тры школы Гарадоччыны. Працэс массавага закрыцця школ раёна распачаўся на пачатку гэтага стагоддзя, калі была зачынена Канчанская базавая школа. Потым амаль кожны год закрывалася па адной-дзве школы раёна. Гэты працэс быў выклікан, як выміраннем сельскага насельніцтва раёна, так і працэсам узбуйнення калгасаў і саўгасаў раёна.

Калі ў 1994 годзе ў сельскай мясцовасці пражывала болей 24 тысяч насельніцтва, то ў 2016 годзе засталося без вайны і эпідэміі менш 10 тысяч. Адпаведна з 35 калгасаў і саўгасаў пасля «рэфармавання» засталося менш 10. Пра дзейнасць гэтых гаспадарак статыстыка ў «Гарадоцкім весніку» ўжо не ўзгадваецца.

У выніку знікнення працоўных месцаў у вёсках раёна сталі раз'яджацца бацькі з дзецьмі, нараджальнасць у вёсках раёна імкліва скарацілася і ў школу ўжо не стала каму хадзіць. Працэс закрыцця школ закрануў тыя, дзе, як правіла, вучняў на 9-11 класаў стала менш 30 дзетак пры колькасці педагогаў і тэхнічнага персаналу пад 20 чалавек. У выніку не стала школ у Газьбе і Вярэчы, Обалі і Пралетарцы, Хвошна і Мехавым, Гурках і Халамер'і, Рудні і Марчанках і г.д.

І вось у гэтым годзе ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу адразу закрываюцца тры школы. Гарадоцкі аддзел адукацыі правёў планавыя сустрэчы ў калектывах закрываемых школ аб закрыцці школ і працаўладкаванні педагогаў, якія не дасягнулі пенсійнага ўзросту. Большасць педагогаў атрымала рэальныя прапановы аб сваёй працы ў новым навучальным годзе.

На наступны навучальны год у Гарадоцкім раёне застанецца працаваць толькі 11 школ, у якіх будзе навучацца каля дзвюх тысяч вучняў..

Усяго па Віцебскай вобласці не пачнуць працу ў новым навучальным годзе каля 50 педагагічных калектываў, якія сёння праводзяць «Апошні званок»

Л. Антонаў

Аб'ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з'яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета "Гасцінец" пачала размешчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе ствараецца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

ФУТБОЛ

АТРЫМАЛІ ТРЭЦЦЮЮ ПЕРАМОГУ ЗАПАР І СТАЛІ ЛІДАРАМІ

11 чэрвеня на сваім полі ФК «Прамень — Кроў СК» перамог ва ўпартай барацьбе чэмпіёна Віцебскай вобласці 2014 года ФК «Днепр» (Дуброўна) з лікам 2:1.

Футбалісты з Дуброўна гулялі ў Гарадку свой другі матч гэтага сезону пасля сакрушальнай паразы на сваім полі ад ФК «Газавік» (Віцебск) — 1:6. Дубровенскія футбалісты да таго ж памяталі мінулагоднюю вераснёўскую паразу ў Гарадку з лікам 3:4, калі вырашальны мяч па іх меркаванню апынуўся ў іх браме са становішча па-за гульні.

У сурьёзнасці намераў гасцей даць бой нашы гульцы пераканаліся ўжо ў першым тайме, калі футбалісты з Дуброўна адкрылі лік. Гарадоцкія футбалісты прыклалі намаганні, каб зраўняць лік і ў першым тайме гэта атрымалася зрабіць Яўгену Самарыну. А на пачатку другога тайму Вячэслаў Мочкін, ветэран гарадоцкага футболу, з падачы Іллі Жарнасек вывеў гарадоцкіх футбалістаў наперад. Госці імкнуліся ў далейшым зраўняць лік, але Павал Хацько захаваў браму недатыкальнай.

Трэнер нашых футбалістаў Сяргей Куракоў так ацаніў гульню: «Сложная игра, победа на нервах. Может мы не дооценили, или это наш уровень. Надо разбираться. В центре мяч не держим, обостряющие передачи не проходят. Во втором тайме немного перестроились, взяли инициативу, есть хорошие, техничные ребята, которые могут развернуть игру в любое положение. Но, надо стараться всё делать как можно быстрее, в этом и заключается уровень игрока. Кто-то играет в касание, а большинство в 2-3.

Мы это всё видим, но для нас играет важную роль отношение к делу, если человек предан нам, мы всегда поддержим и поможем. С Победой друзья, она трудная, но она наша!!!!!!!!!!»

Склад ФК «Прамень — Кроў СК»: Хацько — Кавалёнак, Данчэнка, Дзядзічкін (Жогаў), Калтуноў-Самсаненка(Мочкін), Шыла, Рудоў (Аўсяннікаў), Галуза, Самарын — Жарнасек.

У трэццім туры ў нашай зоне «Газавік» на сваім полі перамог ФК «Бешанковічы» з хакейным лікам — 6:4 і стаў лідарам з 9 ачкамі. Столькі ж і ў нашых футбалістаў, але горшая розніца забітых і прапушчаных мячоў.

Л. Антонаў

НАША СПАДЧЫНА

ГЕНАДЗЬ КІСЯЛЁЎ, ЯК АДКРЫВАЛЬНІК КАНСТАНЦІНА ВЕРАНІЦЫНА

Так любімая многімі пакаленнямі беларусаў паэма «Тарас на Парнасе», якая набыла вядомасць яшчэ ў XIX стагоддзі, заставалася ананімнай больш за стагоддзе. Для гісторыка і літаратуразнаўцы Г.В. Кісялёва (на здымку) устаноўленне асобы «бацькі» палясоўшчыка Тараса стала справай жыцця.

Генадзь Васільевіч вёў пошукі, вывучаючы архівы, сустракаючыся з рознымі людзьмі, даследуючы літаратуру. І ў 1973 г. ён дабіўся поспеху.

Пытанне аб аўтарстве паэмы хвалявала многіх літаратуразнаўцаў, вучоных, крытыкаў. Меркавалася, што «Тараса на Парнасе» напісаў В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, А. Вярыга-Дарэцкі, студэнты Горы-Горацкага земляробчага інстытута...

У рукапісным сшытку паэта і фалькларыста А.Ф. Рыпінскага, які захоўваўся ў прафесара БДУ М.М. Піятуховіча былі тэксты паэм «Тарас на Парнасе» з подпісам «Канстанцін Вераніцын, 15.04.1855, Гарадок» і «Два д'яблы» з подпісам «7.04.1860 год, г. Масква, К. Вераніцын». Але М.М. Піятуховіч лічыў, што Вераніцын — гэта псеўданім.

3 лістапада 1973 года ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі Г.В. Кісялёў знайшоў дакументы Горы-Горацкага земляробчага інстытута і ўстанавіў, што Канстанцін Васільевіч Вераніцын нарадзіўся 1 чэрвеня 1834 г. ў в. Астраўляны Віцебскага пав. Быў прыгонным селянінам памешчыка В.М. Бондырава, ёсць меркаванні, што яго пазашлюбным сынам. У 1844 г. скончыў Гарадоцкае прыходскае вучылішча. Атрымаўшы вольную, ён паступіў у Віцебскую губернскую гімназію. У 1852 г. прыпісаўся ў гарадоцкія мяшчане і змяніў прозвішча Васільеў на Вераніцын. У 1852 г. паступіў у Санкт-Пецярбургскую медыка-хірургічную акадэмію, адкуль праз два гады быў выключаны. Менавіта ў гэты час Канстанцін напісаў у г. Гарадку «Тараса на Парнасе».

У 1859 г. К. Вераніцын у ліку лепшых выпускнікоў скончыў Горы-Горацкі земляробчы інстытут, кіраваў маёнткам на Магілёўшчыне, выкладаў у Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі, быў стацкім саветнікам у Пецярбургу...

Зыходзячы з устаноўленых Г.В. Кісялёвым звестак, пацверджанне знайшлі ўсе здагадкі, што выказваліся даследчыкамі пра беларускае паходжанне аўтара, добрае веданне ім сялянскага побыту в. Пуцявішча непадалёк ад Астраўлян, віцебскую гаворку, дасведчанасць у рускай культуры і літаратуры.

— Для яго (К. Вераніцына) жыццяпісу характэрна тое, што і для самой паэмы — сінтэз, зліццё беларускай народнай стыхіі з рускай кніжнай культурай, — пісаў Г.В. Кісялёў. — Гэта здольны чалавек з народа, якому, папярок усім перашкодам, удалося атрымаць адукацыю. Выхадзец з ніжэйшых пластоў зняволенага сялянства, былы прыгонны, ён добра ведаў душу, мову, побыт народа.

Даць такую трапную адзнаку адзін з самых выдатных, глыбокіх і выніковых беларускіх гісторыкаў літаратуры і літаратуразнаўца XX стагоддзя меў поўнае права. Яго слова, аўтарытэтнае, дакладнае, — у прыватнасці, дылогія аб пошуках аўтараў ананімных на той час паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» пад назвай «Адшукваецца класік» (1989 г.) падштурхнула іншых літаратуразнаўцаў да пошукаў новых дакументаў і фактаў, што тычацца аднаго з лепшых твораў беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

На Гарадоччыне, пачынаючы з 1997 г., рэгулярна праходзяць Вераніцынскія краязнаўчыя чытанні, тэматычныя канферэнцыі, конкурсы, мастацкія пленэры, выязныя экскурсіі. У 2001 г. ля Гарадоцкага раённага краязнаўчага музея і ў в. Астраўляны ўсталяваны памятныя знакі ў гонар паэмы «Тарас на Парнасе» і яе аўтара, а ў 2014 г. у скверы па вул. Савецкай у райцэнтры — выдатны помнік палясоўшчыку Тарасу.

З 2009 г. кожны чэрвень ладзіцца раённае свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору «Гарадоцкі Парнас». Усё гэта становіцца брэндам Гарадка.

Такім чынам гарадакчане ўшаноўваюць памяць свайго самага славутага земляка К. Вераніцына і дзякуюць Г.В. Кісялёву — чалавеку, які праліў святло на таямніцу яго імя. Яно, дарэчы, ставіцца на сучасных выданнях паэмы з 2008 г.

Падрыхтавала Святлана ЯКАЎЛЕВА
garadvest.by

ЗДАРЭННЕ

«ПОДЖЕГ» ДЕТСКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ В БОЛЬНИЦЕ

Мужчина пришел в районную больницу проведать свою сожительницу, но его не пустили в отделение. Медперсонал обратил внимание на то, что посетитель был явно нетрезв, рассказывает «СБ Беларусь Сегодня».

Подруга вышла к нему в фойе, но мужчина решил отомстить сотрудникам больницы, проверив, насколько скрупулезно они исполняют другие обязанности. Чем завершилась нежданная «инспекция», рассказал заместитель прокурора Городокского района Максим Зиновик:

— Визитер попросил у сожительницы мобильный телефон и набрал номер МЧС. Сообщил, что в детском отделении и палатах интенсивной терапии возник пожар. Причина, мол, в том, что медперсонал больницы неосторожно сушил пеленки. Теперь детишкам и их матерям грозит опасность.

В МЧС незамедлительно выслали в больницу 11 нарядов. Это были люди и пожарные машины не только из местного РОЧС, но из Шумилино и Витебска. В это время поднятые по тревоге сотрудники больницы безуспешно искали место возгорания.

«Шутника» вскоре задержали. Теперь ему грозит до 5 лет лишения свободы. Специалисты подсчитывают ущерб, нанесенный заведомо ложным сообщением об опасности.

Елена Бегунова
СБ Беларусь Сегодня

ПЬЯНАЯ ДЗЯЎЧЫНА АДКУСІЛА СУСЕДУ ВУХА

Інцыдэнт здарыўся ў дзённы час. Малады чалавек зайшоў у госці да суседкі. Па словах 28-гадовай жанчыны, мужчына зрабіў ёй непрыстойнае прапанову. Яна абурылася, і сварка перарасла ў бойку.

Госць ударыў суседку кулаком у твар, але тая пачала выштурхоўваць яго з пакоя. Хлопец сыходзіць не хацеў і схапіў дзяўчыну за шыю, а жанчына ўкусіла яго за вуха.

Падрабязнасці распавёў намеснік пракурора Гарадоцкага раёна Максім Зіновік:

— У міліцыю спачатку патэлефанаваў пацярпелы і паведаміў, што пазбавіўся вуха. А літаральна праз пару хвілін званок зрабіла яго крыўдзіцца: заявіла аб тым, што ён яе ўдарыў і чапляўся. Калі следчыя прыбылі на месца здарэння, то выявілі і кавалак вуха, і сляды барацьбы.

Цяпер праводзіцца праверка, казаць аб тым, хто і за што будзе пакараны, пакуль рана. Але калі знойдуцца доказы таго, што дама дзейнічала не ў мэтах самаабароны, то за нанясенне цяжкіхцялесныхпашкоджанняў, якія прывялі знявечання асобы суседа, ёй пагражае да 8 гадоў пазбаўлення волі.

Дарэчы, пасля таго, што здарылася абодва фігуранты прайшлі экспертызу на алкаголь — у крыві дзяўчыны выяўлена 1,8 праміле, а ў яе «сябра» — 2 праміле.

Алена Бегунова

sb.by

ЗГАРЭЛА ЛАЗНЯ, АЎТАМАБІЛЬ І СКУТЭР

5 чэрвеня ў г.п. Езярышча пасля абеду адбыўся пажар лазні ў выніку якога знішчаны таксама аўтамабіль Мэрсэдэс-Бенц 202 і скутэр Сузукі

Паводле інфармацы прэс-службы Віцебскага ўпраўлення МНС 5 чэрвеня ў 14-41 ў Гарадоцкі аддзел МНС паступіла паведамленне аб пажары лазні па вул. Піянерскай ў г.п. Езярышча Гарадоцкага раёна. У выніку пажару ў лазні 6×6 м знішчаны дах, столевае перакрыцце, пашкоджаны сцены. Адначасова з гэтым знішчаны стаячыя ля лазні аўтамабіль Мэрсэдэс-Бенц 202, 1995 г.в., скутэр Сузукі, 2005 г.в.

Прычына пажару высвятляецца. Гэта другі пажар за тыдзень у Езярышчы і чацвёрты ў раёне. Лета на Гарадоччыне пачалося з пажараў..

Т. Гаражанка

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

ЛІСА І ПРАГНЫЯ МЯДЗВЕДЗІКІ

Беларуская мадэль выглядае ўнікальнай толькі на фоне сваіх заходніх суседзяў. Сучасны этап у развіцці беларускай мадэлі найбольш ёміста перадае слова «цугцванг» — становішча ў шахматах, у якім любы ход вядзе да пагаршэння пазіцыі.

Згодна з Вікіпедыяй, памылка — ненаўмыснае адхіленне ад правільных дзеянняў, учынкаў, думак. Звярнуцца да гэтага паняцця і паставіць яго ў цэнтр чарговай «Азбукі паліталогіі» мяне натхніў артыкул паліталога Уладзіміра Роўды «Чаму Усебеларускі народны сход будзе праводзіцца ў разгар крызісу?», апублікаваны на сайце «Наша думка».

Цытую: «Змена вектара знешняй палітыкі магла б стаць адным з ключавых пытанняў парадку дня Усебеларускага народнага сходу. Але гэтага не адбудзецца. Дадзеная праблема не будзе нават узнятая на гэтым цалкам пустым мерапрыемстве, таму што А. Лукашэнка прызвычаіўся вырашаць усе найважнейшыя пытанні развіцця краіны самастойна. Калі б усё адбывалася інакш, дык пры планаванні палітычнага курсу не было б дапушчана столькі шмат грубых памылак: мы б сапраўды даўно жылі зусім у іншай краіне».

Дык вось у чым справа! Аказваецца, беларуская мадэль з усімі яе аўтарытарна-таталітарнымі асаблівасцямі сфармавалася ў выніку чарады кіраўнічых памылак. Г. зн. першапачаткова яе бацькі-заснавальнікі, абапіраючыся на мандат большасці беларусаў, планавалі крочыць у правільным кірунку. Але ў выніку ненаўмысных адхіленняў (памылак) атрымалася тое, што атрымалася.

Але калі гэта так, дык сітуацыю можна выправіць. Усё, што неабходна, гэта, па-першае, прызнанне «вертыкаллю» сваіх памылак і, па-другое, сур'ёзная работа па іх ліквідацыі. Будзем спадзявацца, што на выкананне гэтай праграмы і скіруюць свае намаганні дэлегаты Пятага Усебеларускага народнага сходу.

У імя вышэйшых інтарэсаў дзяржавы

Унікальнасць беларускай мадэлі не варта перабольшваць. Каб зразумець гэту азбукавую ісціну, нам варта зрабіць кароткі гістарычны экскурс.

На працягу тысячагоддзяў існавала ў асноўным два тыпы дзяржаўных утварэнняў (калі не лічыць пераходныя). Першы і тыпалагічна больш ранні — усходні. Ён аб'ядноўвае ўсе цывілізацыі па-за Еўропай. Яго сэнс заключаецца ў структуры ўлады-ўласнасці, што на практыцы азначала поўнае дамінаванне ўлады ў дзяржаве (знаёмы выпадак, ці не так?).

У дзяржавах такога тыпу ўсе багацці і здабыткі грамадства знаходзяцца ў фактычнай уласнасці кіраўніка і апарата яго адміністрацыі. «Папракаюць: Лукашэнка прыватызуе Беларусь... Але гэта мая Беларусь. І я баюся, што раптам будзе не так, і ты ўжо нічым не дапаможаш. <...> У мяне, акрамя краіны, нічога няма». Лепшага тлумачэнні паняцця «ўлада-ўласнасць», мабыць, і не знайсці.

Права цэнтралізаванага размеркавання рэсурсаў недатыкальнае, а сістэма ўлады арганізавана такім чынам, каб уся моц была сканцэнтраваная ў руках кіраўніка. «Гэтая канцэнтрацыя, — тлумачыць гісторык Леанід Васільеў, — неабходная для выжывання і ўмацавання соцыуму, што ён інтуітыўна ўсведамляе і, як правіла, супраць усёмагутнасці вярхоўнай улады не пратэстуе».

Вышэйшая ўлада ў гэтай структуры ўсёмагутная, насельніцтва ж знаходзіцца ў статусе бяспраўных падданых, што не адмяняе права на прыватную ўласнасць. Аднак у любы момант яна можа быць канфіскавана ўладай у імя вышэйшых інтарэсаў дзяржавы і яе вярхоўнага кіраўніка.

«Кажуць: «Лукашэнка баіцца прыватніка і прыватнай уласнасці — гэта пагроза ўладзе». Ды хопіць вам... З любым прыватнікам значна прасцей працаваць, чым з дзяржаўным прадпрыемствам». На чым заснавана такая ўпэўненасць адзінага палітыка (АП)? Адказ відавочны: «Яму (прыватніку) сказаў — ён зробіць. Таму што, па вялікім рахунку, рызыкуе ў адваротным выпадку страціць сваю ўласнасць...»

Сэнс улады-ўласнасці відавочны: чалавек дзеля дзяржавы, г.зн. дзеля тых, хто займае ў кіраванні камандныя пасады.

Але чаму такі прынцып арганізацыі існаваў на працягу тысячагоддзяў? Усё вельмі проста: безгоннае насельніцтва стала б лёгкай здабычай для любога гвалтаўніка, пачынаючы ад ордаў качэўнікаў і заканчваючы суседнімі дзяржавамі. Але за ўсё ў гэтым жыцці даводзіцца плаціць. За моц «моцнай дзяржавы» насельніцтву на працягу тысячагоддзяў даводзілася расплачвацца пагалоўным рабствам.

Падтрымала 58,3%, не падтрымала 17,6%

Другі тып дзяржаўнага ўтварэння — заходні, антычнай-буржуазны. Яго радзіма — антычная Грэцыя, а базавы інстытут — поліс. Цэнтр поліса — горад з адміністрацыйнымі і культавымі будынкамі. Зямлі вакол — надзелы грамадзян, паўнапраўных чальцоў гарадской грамады гэтага поліса. Тут няма падданых і ўладара.

Грамадства раўнапраўных грамадзян само выбірае магістрат з грамадзян, якія часова займаюць пасады і пераабіраюцца. Яно ж пад кіраўніцтвам найбольш выбітных сваіх прадстаўнікоў стварае законы, арганізуе суд і будуе грамадскія збудаванні.

Зразумела, ёсць бясправныя рабы і чужаземцы-чужынцы. Грамадства пярэстае і няроўнае,



але аснова яго — грамадзяне, ад якіх залежыць выбарная ўлада. Гэта структура грамадзянскай супольнасці. Тут дзяржава дзеля чалавека.

Перакос сучаснай беларускай дзяржавы ў бок першага тыпу відавочны. Але так было не заўсёды. Прыхільнікі еўрапейскага выбару любяць спасылацца на Вялікае Княства Літоўскае. Безумоўна, яно было часткай заходняга свету, у якім адносіны паміж васаламі і сеньёрамі мелі на ўвазе дамову з наяўнасцю правоў у абодвух бакоў. Тут дарэчы будзе прыгадаць і сістэму самакіравання гарадоў. Ратушы на цэнтральных плошчах — жывыя сведкі слаўнага еўрапейскага мінулага.

Чаму ў 1795 годзе пад еўрапейскай гісторыяй была праведзена тлустая рыса — асобная тэма. Але сёння мы маем грамадства, якое 24 лістапада 1996 года на рэспубліканскім рэферэндуме адмовілася выбіраць кіраўнікоў мясцовай улады. За абранне прагаласавала 28,14%, супраць — 69,92% (ад колькасці тых, хто прыняў удзел у галасаванні).

Мне запярэчаць, што другі канстытуцыйны рэферэндум быў адзначаны дэбютам Лідзіі Ярмошынай у якасці кіраўніка ЦВК, таму ўспрымаць афіцыйныя вынікі галасавання варта з пэўнай доляй скептыцызму. Пярэчанне прымаецца. Аднак я нешта не ўзгадаю масавых пратэстаў з нагоды вынікаў рэферэндуму, а праведзенае ў чэрвені 1997 года апытанне НІСЭПД паказала, што праект Канстытуцыі ў рэдакцыі АП падтрымалі 58,3% беларусаў, не падтрымалі — толькі 17,6%, пры 24,1% тых, хто не прыняў удзелу ў галасаванні.

Важна разумець, што першы тып дзяржаўнасці («загадны») трымаецца на падтрымцы мас знізу, а не на ўладзе эліты. І калі разбурыць такую ўладу, дык вынікам разбурэння зусім не абавязкова стане ўсталяванне дэмакратыі заходняга ўзору. У пачатку 90-х гадоў мы мелі магчымасць назіраць і працэс разбурэння, і наступную за ім рэгенерацыю загаднага тыпу дзяржавы.

Зноў звернемся па дапамогу да гісторыка Леаніда Васільева: «Выхоўваць трэба, у першую чаргу, масы, а не эліту. Я хачу нагадаць казку пра двух прагных мядзведзікаў (якія дзялілі пароўну галоўку сыру і ў пасрэдніку ўзялі лісу). З гэтай казкі відаць, што выхаванне трэба пачынаць не з лісы, а з мядзведзікаў».

(скарочана)

Сяргей Нікалюк
"Новы час"

НАША ВЛАСТЬ

ЧЕМУ ТАК И НЕ СМОГ НАУЧИТЬСЯ ЛУКАШЕНКО

«Скажите, где наши недостатки, и мы исправимся». Такое обещание Александр Лукашенко дал вице-президенту Всемирного банка. «Салідарнасць» решила вспомнить, чему еще обещал, но так и не смог, научиться Лукашенко.

Общаясь с представителем Всемирного банка, Александр Лукашенко был сама любезность, рассыпаясь в комплиментах и обещая выполнить все рекомендации. Что, впрочем, неудивительно, учитывая острую необходимость белорусского руководства в деньгах.

— Я хотел бы, чтобы вы мне сказали, где наши недостатки, и мы обязательно исправим ситуацию, — заявил глава Беларуси. — Поскольку ваше финансирование, особенно в этой ситуации, дает возможность тысячам людей иметь работу и создавать прекрасные объекты. Опыт сотрудничества с вами — открытый, принципиальный — является для нас определенной школой.

Какие уроки преподаст Всемирный Банк Александру Лукашенко, пока неизвестно, но то, что ученик ему попался не самый способный — факт. Судите сами.

Как обещал научиться соблюдать права человека

Еще в 2010 году Александр Лукашенко пообещал научиться у европейцев соблюдению прав человека:

— Нас начали сразу же обвинять по правам человека и прочее... Что-то не нравится, но я им всегда говорю при встрече: «Вы нам говорите, мы хорошие ученики, если видите, что мы что-то не так делаем, вы нам подскажите». Не понукайте, скажите, — заявил он на VI съезде Федерации профсоюзов Беларуси.

Прошло 6 лет. За это время практически полные сроки успели отмотать отправленные за решетку политзаключенные. Чтобы оценить, какие уроки усвоил «хороший ученик» Александр Лукашенко, достаточно посмотреть на то количество судов, которые чуть ли не ежедневно проходят в Беларуси в отношении общественных активистов. Согласно отчету спецдокладчика ООН по ситуации в Беларуси Миклоша Харасти, «ситуация с правами человека в Беларуси не изменилась».

Кстати, Беларусь по-прежнему остается единственной страной в Европе и на постсоветском пространстве, где до сих пор применяется смертная казнь.

Как обещал научиться у американцев поднимать уровень жизни народа

Очевидно решив, что уже усвоил уроки в сфере бизнеса, глава Беларуси решил замахнуться на большее. Встречаясь в 2015 году с американскими конгрессменами, Лукашенко попросил их снова высказать свои предложения и замечания.

— Мы не любим, когда нас толкают в спину, мы никогда не согласимся с тем, когда нам навязывают силой какую-то волю. Но мы хорошие ученики. Если вы нам предложите варианты, которые будут продвигать нашу страну к суверенитету, большей независимости, если вы нам предложите варианты, которые будут улучшать жизнь белорусского народа, мы будем вам очень благодарны и немедленно возьмем их на вооружение, — заявил тогда Лукашенко.

Но то ли американцы чего-то не того насоветовали белорусскому президенту, то ли опять ученик оказался не очень способный, но с тех пор уровень жизни белорусов не то, что не приблизился к американскому, а снизился даже по отношению к собственным недавним показателям. Количество семей, живущих за чертой бедности, неумолимо растет, зарплаты снижаются, а власти только и делают, что рекомендуют белорусам «потуже затягивать пояса».

Как обещал научиться у европейцев «всему»

Об этом он заявил в интервью французской газете «Фигаро» в 2010 году.

— Мы больше чем разочарованы. Мы вообще порой не понимаем, чего хочет Европейский союз, — удивлялся тогда Лукашенко и добавлял: — Мы хорошие ученики, мы готовы у вас учиться всему тому, что соответствует интересам белорусского народа, и тому, что не создает проблем нашим соседям, то есть Европейскому союзу, Украине, России, другим народам мира. Мы готовы в этом направлении учиться у вас.

И снова провал.

Вобщем, с учебой у Александра Лукашенко пока выходит не очень. Единственное, чему он научился за все это время, это давать обещания. Жаль только, подкрепить их реальными действиями пока не получается.

(скарочана)

Павел Дмитриев
gazetaby.com

ГУЧНАЯ СПРАВА

ФЭНОМЭН СПРАВЫ ГАННЫ ШАРЭЙКІ ЯК ІЛЮСТРАЦЫЯ АБСУРДУ

Звычайна, гучныя судовыя працэсы канчаюцца прысудам. Пасьля чаго адбываецца тое, што можна перадаць назвай старога італьянскага фільму «Сьледзтва закончана, забудзьце». У справе дырэктаркі Віцебскай птушкафабрыкі і чальца Савету Рэспублікі Ганны Шарэйкі ўсё адбываецца з дакладнасьцю наадварот.

Вызваленьне з-пад варты ператварыла яе на кароткі час у галоўную мэдыйную пэрсону. Спачатку яна дала дзіўны камэнтар, у якім дзякавала сваім крыўдзіцелям, што выклікала вялікі рэзананс у сацыяльных сетках. Потым гэтую жанчыну сустрэлі як гераіню на яе фабрыцы. Савет Рэспублікі датэрмінова перапыніў паўнамоцтвы Ганны Шарэйкі. І адначасова Віцебскі аблвыканкам прызначыў яе дырэктаркай той самай Віцебскай птушкафабрыкі.

Судовы працэс над Ганнай Шарэйкай і яе паплечнікамі ўнікальны ў некалькіх аспэктах. Хоць падобныя гучныя працэсы ў Беларусі ня рэдкасьць, а хутчэй, правіла, аднак па ступені абсурднасьці гэтая драматычная гісторыя стаіць асобна.

Апошнім часам крымінальны перасьлед ідзе па адпрацаванай схеме: буйнога бізнэсоўца, дырэктара дзяржпрадпрыемства ці чыноўніка садзяць за краты і прапануюць зьдзелку: прызнай віну, заплаці выкуп і выходзь на свабоду. Бо беларускія суды апраўдальных прысудаў практычна не выносяць, і гэта не залежыць ад рэальнай віны чалавека. Большасьць прымаюць прапанаваную зьдзелку, пра што сьведчаць прыклады прадпрымальніка Віктара Пракапені ці спартовага журналіста і чыноўніка Ўладзімера Бяражкова. Ганна Шарэйка і яе паплечнікі (за адным выключэньнем) адмовіліся ад зьдзелкі, настойвалі на сваёй невінаватасьці. Таму адсядзелі два гады.

Крымінальная справа настолькі была прыдуманай і развалілася ў судзе, што нават пракурор быў вымушаны прызнаць: матэрыяльных стратаў прадпрыемству гэтыя людзі не нанесьлі. Але, на ягоную думку, і гэта першы абсурд, нанесьлі страты дзяржаўным і грамадзкім інтарэсам. Што выглядала вельмі дзіўна. Гэта як? Але апраўдаць гэтых людзей суд ня мог паводле вызначэньня, бо, як вядома, «нашы органы не памыляюцца». Таму прыдумалі амністыю і вызвалілі ў зале суду.

Пасьля арышту кіраўніцтва Віцебскай птушкафабрыкі на чале з дырэктаркай спраўная, прыбытковая птушкафабрыка адразу выявілася стратнай. І навошта было марынаваць два гады людзей у турме, калі, як высьветлілася, матэрыяльных стратаў прадпрыемству гэтыя людзі не нанесьлі? Каб і хацеў наглядна прадэманстраваць заганнасьць і абсурднасьць існай сыстэмы, дык лепшай ілюстрацыі не прыдумаеш.

Зьдзівіла актыўная падтрымка дырэктаркі работнікамі птушкафабрыкі. Звычайна беларусы ня любяць начальства. І калі Лукашэнка ганьбіць і садзіць у турму чыноўнікаў і дырэктараў, то гэта заўсёды сустракала даволі масавую падтрымку грамадзтва. А ў дадзеным выпадку атрымалася ўсё наадварот. Апальную дырэктарку калектыў падтрымаў, людзі прыяжджалі на суд, каб выказаць ёй сваё спачуваньне. А пасьля вызваленьня яе ўрачыста сустрэлі на роднай фабрыцы як гераіню. Гэта зусім новая зьява для Беларусі. І яна сьведчыць пра тое, што давер грамадзтва да дзяржаўных інстытутаў, у прыватнасьці, да сыстэмы правасудзьдзя, спадае.

Яшчэ адзін абсурд. Ганну Шарэйку вярнулі на старую пасаду, то бок яна зноў стала дырэктарам той самай Віцебскай птушкафабрыкі, падчас кіраваньня якой яна, нібыта, нанесла страты дзяржаўным і грамадзкім інтарэсам. Маўляў, няхай і далей наносіць тыя ж страты? Ці так завуаляванa ўлады прызналі сваю памылку? Шукаць лёгіку ў абсурднай сыстэме — справа няўдзячная.

І самы апошні парадокс, ці, можа, таксама абсурд. Адразу пасьля вызваленьня ў зале суду Ганна Шарэйка, на першы погляд, вельмі дзіўным чынам пракамэнтавала ўсю гэтую трагічную гісторыю, якая зь ёй здарылася. Яна дзякавала тым, хто яе засадзіў у турму — суду, работнікам СІЗА, дзяржаве за тое, што сочаць за парадкам:

«Я ўвесь час спадзявалася на справядлівасьць. На жаль, не зусім так, але і за гэта дзякуй. Больш ці менш, але ўсё роўна разабраліся і нас адпусьцілі... Правяралі, але яны і павінны былі правяраць. А як па-іншаму? Я разумею тую заклапочанасьць дзяржавы, якая хоча, каб усюды быў парадак. Калі што — потым разьбіраюцца. І па справе Мальцава таксама разабраліся. Нашы органы нельга ашукаць. Я вельмі ўдзячная гэтаму СІЗА за тое, што яны ставяцца да ўсіх аднолькава. Я павінна сказаць дзякуй за тое сваё затрыманьне. Нічога, гэта для нас таксама нейкі ўрок, загартоўка. Людзі, якія моцныя па жыцьці, не становяцца слабейшымі ў такіх месцах. Толькі мацнейшымі: яшчэ больш гартуюцца і больш хочуць працаваць, прыносіць карысьць».

Усё гэта было сказана шчыра. Перад намі проста клясыка таталітарнай сьвядомасьці, таталітарнай псыхалёгіі. І цяпер я больш разумею тых людзей, якія, прасядзеўшы 20 гадоў у сталінскіх лягерах, дзякавалі партыі і ўраду, ці тых, хто перад расстрэлам крычаў: «Няхай жыве Сталін!». Дасюль гісторыкі спрабуюць разгадаць загадку, чаму старыя бальшавікі падчас судовых працэсаў 1930-х гадоў прызнаваліся, што яны шпіёны і інш. Справа ня толькі ў тым, што іх катаваньнямі прымусілі так рабіць. Гэтых людзей яшчэ і ўпэўнілі, што так патрэбна партыі. І яны пагадзіліся.

Таталітарная ідэалёгія грунтуецца на культе дзяржавы, звышмагутных, звышмудрых дзяржаўных інстытутаў, апэляцыі да дзяржаўнай неабходнасьці, захопленьні ад духоўнага зьліцьця з уладай. У рамках такой сыстэмы каштоўнасьцяў чалавек зьяўляецца толькі шрубкай. Неабходны яе элемэнт — самаахвярнасьць.

Мы проста недаацэньваем, як глыбока такая псыхалёгія пануе ў асяродзьдзі чыноўнікаў.

Адна з адметнасьцяў беларускай намэнклятуры палягае ў тым, што яна і раней была шчыра савецкая. І рэшткі гэтай псыхалёгіі мы назіраем цяпер. Узгадаем, як віцэ-прэм'ер Натальля Качанава на пытаньне пра нізкія заробкі бюджэтнікаў адказала, што яны ж «гасударавы людзі». У тым сэнсе, што найперш яны павінны думаць пра інтарэсы дзяржавы, а не пра ўласныя заробкі.

А Ганну Шарэйку па-чалавечы шкада. Два гады, выкрасьленыя з жыцьця, ды яшчэ з публічнай ганьбай, проста так, зь дзяржаўнай мэтазгоднасьці.

Валер Карбалевіч
"Радыё Свабода"

У СУСЕДЗЯЎ

КАК ИЗМЕНИЛАСЬ УКРАИНА ЗА ПОСЛЕДНИЕ ДВА ГОДА

Многие белорусы по-прежнему узнают о событиях в Украине через призму российских и белорусских телеканалов, которые настойчиво транслируют атмосферу «бардака», который якобы только и происходит в соседней стране.

Справедливости ради, «Салідарнасць» публикует подборку некоторых любопытных изменений, которые произошли в Украине за последние два года и на которые белорусским чиновникам, как минимум, стоит обратить внимание.

1. «Новая полиция» на велосипедах

За полтора года Украине произошла реформа местной милиции, которая считалась одной из самых коррумпированных в СНГ. С помощью нее с дорог пресловутых «гаишников» и заменили их вежливыми и улыбчивыми «новыми полицейскими».

В чем секрет успеха? Новую патрульную службу создавали с нуля и через открытый конкурс: новым сотрудникам гарантировали высокую зарплату (около 500 долларов), оснастили их новым оборудованием, а также портативными видеокамерами, которые онлайн контролируют каждый шаг полицейского. Теперь у местной полиции совершенно новая философия — это, в первую очередь, сервисная служба, которая должна помогать людям.

Кстати, совсем недавно на улицах украинских городов появились еще и велопатрули — они будут следить за порядком в парках и зонах отдыха.

2. Государственные закупки «на миллиард»

К началу 2017 года абсолютно все государственные закупки в Украине переведут в электронный формат. Для этого местные волонтеры при поддержке Евросоюза создали специальную систему Prozorro, которая позволяет отслеживать, насколько эффективно была потрачена каждая гривна.

По мнению экспертов, система позволяет экономить 15-20% государственных средств. По прогнозам, это даст бюджету около 2 миллиардов долларов экономии в год.

3. Электронное правительство

Еще один перспективный украинский проект iGov позволяет удаленно получить более 300 административных услуг — например, оформить помощь по уходу за ребенком или перерегистрировать автомобиль, не выходя из дома.

Это первая ступенька создаваемой в Украине системы электронного правительства. Ожидается, что через несколько лет все граждане получат так называемый электронный профиль гражданина — с помощью него возможно будет получить любую необходимую услугу в формате онлайн.

Кстати, есть еще один интересный украинский проект, который совсем не помешал бы Беларуси. Например, одна из местных онлайн-площадок «Слово и дело» ведет постоянный подсчет обещаний политиков! Зеленым цветом отмечаются выполненные, а красным — невыполненные. Мол, выводы делайте сами. Вот вам и «пятьдесят оттенков красного», которые, правда, может увидеть любой желающий.

4. «Бентли» и виллы — в открытом доступе

Весной-2016 всех украинских чиновников обязали подавать электронные декларации. Новые изменения в законодательстве предусматривают — если слуга народа вдруг «забыл» указать роскошный автомобиль или дорогую недвижимость, ему грозит уголовная ответственность.

Чтобы ловить нечестных чиновников было проще, в Украине сделали публичным доступ к реестрам недвижимости и транспортных средств, чтобы буквально каждый гражданин мог проверить, а правильно ли тот или иной чиновник заполнил свою декларацию?

Такое нововведение также неплохо было бы применить в Беларуси, где об элитных коттеджах бывших чиновников люди узнают лишь случайно.

5. Судьи и прокуроры идут под суд

В конце прошлого года в Украине заработал новый правоохранительный орган — Антикоррупционное бюро. Его цель — находить взяточников среди высокопоставленных чиновников. Его создавали при поддержке американского ФБР, а сотрудников набирали через открытый конкурс на высокую зарплату от 1-1,5 тысяч долларов. Результат не заставил себя ждать — новые детективы уже задержали, к примеру, более десятка судей и прокуроров, которых удалось поймать на взятках с поличным.

Напомним, что в Беларуси судьи оказались на скамье подсудимых лишь один раз за более чем двадцать лет.

6. Убыточные предприятия — на откуп иностранцам

Пока белорусы думают, что делать с убыточными крупными государственными предприятиями, в Украине, кажется, уже нашли способ сделать их более успешными, привлекая иностранных антикризисных менеджеров.

Так с мая украинскую железную дорогу возглавил поляк Войцех Бальчун, который в свое время был президентом железнодорожного оператора PKP Cargo. Интересно, что зарплата менеджера составит от 30 до 50 тысяч долларов в месяц.

7. Декоммунизация

Украина, по примеру стран Балтии, стремительно избавляется от советского «наследия». За последние месяцы были переименовано около 900 населенных пунктов, несколько тысяч улиц, а также демонтированы сотни памятников коммунистическим деятелям.

Ожидается, что позже их перенесут в Музей тоталитарного прошлого, который откроется в Киеве. Что ж, наверное, в этом есть смысл — ведь, как замечают эксперты, окружение каждого народа сильно влияет на его ментальность.

Евгений Федоров
gazetaby.com

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V), Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 29.06.2016 у 14.20 Наклад: 290 асобнікаў. Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў. Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў. Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.